**Міхалькова Л.К.,** *ст. выкладчык*

# ЛІТУРГІЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў СУЧАСНАЙ РУСКАЙ ХАРАВОЙ МУЗЫЦЫ

Сучасная харавая музыка знаходзіцца ў працэсе глыбокага абнаўлення, развіваецца пад знакам адраджэння часова забытых жанраў і творчых напрамкаў. Усё больш ўпэўнена набіраюць сілу айчынныя духоўныя жанры. Узбагаціўшы канцэртныя праграмы многіх харавых калектываў, духоўная музыка як бы знайшла другое дыханне. Толькі пасля таго, як рускія літургічныя песнапенні загучалі і за межамі храма (у канцэртах, а таксама ў запісе на пласцінках), стала, нарэшце, магчымым і ў сучаснай кампазітарскай творчасці звяртацца да духоўных жанраў - адной з важнейшых сфер музычнай літаратуры. Да духоўнай музыкі адносяцца творы, напісаныя на царкоўна-кананічныя тэксты, а таксама на тэксты літаратурных твораў, якія трактуюць тэму веры ў Тварца, матывы хрысціянскай любві і боскіх запаведзяў.

У сучасны момант ясна распазнаюцца тры лініі ў межах гэтага творчага напрамку. Да першай з іх адносяцца творы, зробленыя ў межах традыцыі царкоўна-праваслаўнай музыкі і адпаведныя паняццю «строгі царкоўны стыль». Гэта музыка выконваецца ў царкве падчас рытуалу богаслужэння.

Да другой лініі далучаюцца творы, народжаныя ўнутрана свабодным творчым натхненнем: Канцэрт для хору на вершы Рыгора Нарэкацы (вядомага армянскага паэта сярэдневякоўя); «Вершы пакаянныя» (на тэксты аднайменнага старажытнарускага помніка другой паловы XVI ст.) А.Шнітке; «Увасоблены анёл» Р.Шчадрына - харавая музыка на М.Ляскову.

Сюды ж трэба аднесці мініяцюры і раздзелы буйных адначастковых або цыклічных твораў, а таксама эпізоды сімфанічных твораў, якія па музычнаму стылю і зместу літаратурнай асновы прымыкаюць да духоўнай музыкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такую музыку, у якой няма яўных стылёвых папярэднікаў у мінулым, магчыма разглядаць як пачатак новай, самастойнай лініі ў сучаснай духоўна-музычнай творчасці.

Нарэшце, трэцяя лінія займае як бы прамежнае становішча паміж першымі дзвюма - «Літургія Святога Іаана Златавуста» М.Сідзельнікава, «Літургічныя песнапенні» Ю.Фаліка, прысвечаныя яго маці... Гэтыя творы і мноства іншых з поспехам маглі б гучаць як у храме, так і ў канцэртнай зале.

Імкненне дакрануцца да таямніц жыцця і гісторыі аказалася сучасным і для беларускіх кампазітараў, якія атрымоўваюць натхненне сілы ад жыватворных крыніц мінулага («Літургія» А.Залётнева, «Усяночная» С.Бельцюкова, «Малітва» А.Бандарэнкі, «Псалмы» Л.Шлег, «Ратуй нас, Божа» Э.Наско).

Творы беларускіх кампазітараў на духоўную тэматыку адзначаюць новы этап развіцця грамадска-музычнай думкі ў рэспубліцы.

Шырокае выкарыстанне старадаўніх жанраў і стылёвых пластоў выканаўчай дзейнасці харавых калектываў на працягу апошняй чвэрці стагоддзя абумовіла адраджэнне многіх з гэтых жанраў у сучаснай кампазітарскай творчасці: харавога канцэрта (свецкага і духоўнага), духоўнага верша, літургіі і містэрыі.

Новымі з'явамі, якія садзейнічаюць узбагачэнню сучаснай харавой культуры і якія ўзялі пачатак у 80-90 гады, сталі рэгулярныя канцэртныя выступленні царкоўных хароў, масавы выпуск серыі пласцінак з запісам песнапенняў праваслаўнай царквы, а таксама вялікіх літургічных цыклаў у выкананні вядучых калектываў краіны.

Цыклы канцэртаў духоўнай музыкі ў рамках святкавання 1000 - годдзя Хрышчэння Русі ў 1988 годзе былі працоўжаны ў наступным, 1989 годзе. У Маскве прайшлі два фестывалі рускай духоўнай музыкі, цыклы канцэртаў-лекцый «Царква і музыка». Свята славянскай пісьменнасці і культуры таксама суправаджалася канцэртамі.

Восенню 1989 г. адбыўся Першы мінскі фестываль харавых спеваў і духоўнай музыкі, прысвечаны 400-годдзю ўстанаўлення Патрыяршаства на Русі, а ў 1993, 1994 і 1995 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у Магілёве адбыліся I, II і III фестывалі духоўнай музыкі «Магутны Божа».

Узбагачэнне сучаснай музыкі літургічнымі матывамі будзе, несумненна, служыць высакароднай мэце маральнага ўдасканалення чалавека, звяртаючы розум і сэрцы людзей да Дабра, Міра, Згоды і іншых агульначалавечых каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ